**А. А. КВЯТКОЎСКІ,**
старшы выкладчык кафедры методыкі выкладання інтэграваных школьных курсаў
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

Репозиторий БГПУ

# КОМПЛЕКСНЫЯ ЗАДАННІ для паўтарэння і сістэматызацыі вывучанага па тэме «Назоўнік»

## Частка А

**А1.** Адзначце адушаўлёныя назоўнікі:

1) аташэ;
2) рамонак;
3) студэнцтва;
4) нябожчык;
5) акунь.

**А2.** Адзначце рэчыўныя назоўнікі:

1) смутак;
2) лес;
3) пыл;
4) пясок;
5) бор.

**А3.** Адзначце асабовыя назоўнікі:

1) аловак;
2) вучань;
3) заробак;
4) студэнт;
5) акунь.

**А4.** Адзначце зборныя назоўнікі:

1) шлак;
2) асіннік;
3) прафесура;
4) дрожджы;
5) карані.

**А5.** Адзначце назоўнікі агульнага роду:

1) сірата;
2) прадавец;
3) дырэктар;
4) стараста;
5) валацуга.

**А6.** Адзначце правільна пабудаваныя сінтаксічныя канструкцыі:

1) маладая дырэктар школы Наталля Пятроўна;
2) вопытны дызайнер Святлана;
3) ветлівы кандуктар Сцяпан;
4) таленавітая швачка Ларыса;
5) пажылая дацэнт Ксенія Эдуардаўна.

**А7.** Адзначце назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку:

1) сумёты;
2) сцёблы;
3) крупы;
4) цымбалы;
5) пустыні.

**А8.** Адзначце правільна запісаныя формы назоўнікаў:

1) цымбалы;
2) бярвенні;
3) купіны;
4) пёры;
5) голлі.

**А9.** Адзначце радок, у якім няма пятага «лішняга» слова:

1) імяніны, дажынкі, акуляры, буцы, нажніцы;
2) лыжы, граблі, дзверы, сані, нажніцы;
3) канікулы, радзіны, блізняты, адведкі, жалюзі;
4) дэпо, метро, пано, манто, дзяўчо;
5) дрэвы, сталы, газеты, часопісы, дамы.

**А10.** Адзначце назоўнікі мужчынскага роду:

1) ЛіМ (газета «Літаратура і мастацтва»);
2) дыспетчар;
3) БДУ;
4) кніганоша;
5) акуляры.

**А11.** Адзначце правільна запісаныя словазлучэнні:

1) шырокая дзвер;
2) новы педаль;
3) такая глухамань;
4) высокі насып;
5) вялікая стэп.

**A12.** Адзначце характарыстыкі, якія адпавядаюць слову ***міжгор'е***:

1) слова з'яўляецца назоўнікам другога скланення;
2) аснова назоўніка заканчваецца на зацвярдзелы зычны;
3) можа мець форму множнага ліку;
4) назоўнік утвораны складана-суфіксальным спосабам;
5) мае форму ніякага роду.

**A13.** Адзначце правільныя сцвярджэнні:

1) слова *паводзіны* адносіцца да назоўнікаў ніякага роду;
2) род назоўніка *гусь* — мужчынскі;
3) слова *дзяўчына* з'яўляецца назоўнікам 1-га скланення;
4) лікавая форма назоўніка *чарніцы* супадае і ў рускай, і ў беларускай мовах;
5) слова *дрожджы* з'яўляецца рэчыўным назоўнікам.

**A14.** Адзначце назоўнікі, якія спалучаюцца з лічэбнікам ***трое***:

1) дзяўчына;
2) поле;
3) настаўнік;
4) певень;
5) конь.

**A15.** Адзначце правільныя чаргаванні зычных у аснове назоўнікаў:

1) страха — страсе;
2) начлег — на начлезе;
3) рэчка — на рэчцы;
4) быльнёг — у быльнязе;
5) Гамбург — у Гамбурзе.

**A16.** Адзначце правільна запісаныя спалучэнні:

1) з суддзёй Івановым;
2) з плаксам Мішай;
3) з прыгажуняй Жэней;
4) з адзінаццацікласнікам Мікітам;
5) жыць пад Барысавам.

**A17.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме роднага склону адзіночнага ліку маюць канчаткі ***-а (-я)***:

1) рубель;
2) 2020 год;
3) пропуск (дакумент);
4) лістапад (з'ява прыроды);
5) твар.

**A18.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме меснага склону адзіночнага ліку маюць канчаткі ***-у (-ю)***:

1) Георгій;
2) змей;
3) сцізорык;
4) камп'ютар;
5) цар.

**A19.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме творнага склону адзіночнага ліку маюць канчатак ***-ым***:

1) Старобін (горад);
2) Дарвін;
3) Лоеў (студэнт);
4) далягляд;
5) Шамякін (пісьменнік).

**A20.** Адзначце правільна запісаныя спалучэнні:

1) аб Янку Брылі;
2) на нашым дварэ;
3) на сёмым паверсе;
4) аб новым станке;
5) праплываць па Мухаўцы.

**A21.** Адзначце памылкова запісаныя спалучэнні:

1) аб цару Мікалаю;
2) смажыць на алеі;
3) працаваць пад Століным;
4) са старастай Жэнем;
5) з ціхоняй Надзяй.

**A22.** Адзначце словы, дзе трэба ўставіць літару *я*:

1) страшная бо..зь;
2) слаўная Вал..чка;
3) малады пехацін..ц;
4) майская зав..зь;
5) вясновая квец..нь.

**A23.** Адзначце словы, дзе трэба пісаць літару *ь*:

1) песен..ка;
2) вагон..чык;
3) камен..чык;
4) памен..шванне;
5) пілаван..не.

**A24.** Адзначце словы, пры напісанні якіх дапушчаны памылкі:

1) чарэшанка;
2) агурочак;
3) мексіканяц;
4) раззбраенне;
5) Пецячка.

**A25.** Адзначце назоўнікі, якія пішуцца праз злучок:

1) гоф (маршал);
2) лес (прамгас);
3) вярні (дуб);
4) перакаці (поле);
5) контр (адмірал).

Репозиторий БГПУ

**A26**. Адзначце назоўнікі, якія пішуцца разам:

1) паў (Слуцка);
2) контр (атака);
3) вагон (рэстаран);
4) самалёта (вылет);
5) праца (дзень).

**A27**. Адзначце словы, пры напісанні якіх дапушчаны памылкі:

1) паў-фінал;
2) ветлячэбніца;
3) валюта-абмен;
4) экс-міністр;
5) штабкватэра.

**A28**. Адзначце назоўнікі, якія ўтвораны суфіксальным спосабам:

1) шматтыражка;
2) рабочы;
3) двойка;
4) пралеска;
5) лесапарк.

**A29**. Адзначце назоўнікі, якія ўтвораны прыставачным спосабам:

1) абход;
2) недавыкананне;
3) звышкарэктнасць;
4) прапрадзед;
5) прылёт.

**A30**. Адзначце сказы, у якіх *не* з назоўнікамі трэба пісаць разам.

1) Гэта былі нашы (не) прыяцелі.
2) Мы любаваліся (не) забудкамі.
3) Ён быў (не) прыяцель, а вораг.
4) Кожная маці — (не) вораг свайго дзіцяці.
5) Я адчуваў гэту (не) прыхільнасць.

## Частка В

**B1**. З прапанаваных назоўнікаў выпішыце канкрэтны назоўнік:

1) вучоба;
2) гора;
3) лірызм;
4) творчасць;
5) рукапіс.

**B2**. Знайдзіце назоўнік, форма множнага ліку назоўнага склону якога ўтворана няправільна. Запішыце гэты назоўнік правільна.

1) Вокны;
2) лагера;
3) промні;
4) сяляне;
5) моры.

**B3**. Выберыце назоўнік, род якога ў рускай і беларускай мовах не супадае. Запішыце гэты назоўнік па-беларуску.

1) Цитадель;
2) всадник;
3) цепь;
4) утюг;
5) старшина.

**B4**. Выберыце назоўнік, лік якога ў рускай і беларускай мовах не супадае. Запішыце гэты назоўнік па-беларуску.

1) Шахматы;
2) кружево;
3) поединок;
4) учебник;
5) обычай.

**B5**. Знайдзіце спалучэнне з граматычнай памылкай. Запішыце гэта спалучэнне правільна.

1) Купацца ў рэчцы;
2) спяваць у гаі;
3) праехаць па вёскам;
4) аб вучню Юрыю Цімашэнку;
5) ганарыцца Чарлі Чаплінам.

**B6**. Выпішыце назоўнік, які ў форме меснага склону адзіночнага ліку мае канчатак *-е*:

1) рог (вуліцы);
2) Цімох;
3) скрутак;
4) рог (каровы);
5) сполах.

**B7**. Знайдзіце канструкцыю, якая не адпавядае норме. Запішыце гэту канструкцыю правільна.

1) Крык гусей;
2) шмат каменняў;
3) прыхіліўся да дзвярэй;
4) поўныя прыгаршчы малін;
5) выплакаў многа слёз.

**B8**. Запішыце назоўнік **Об** (рака) у форме творнага склону адзіночнага ліку.

**B9**. Знайдзіце назоўнік, пры напісанні якога дапушчана памылка. Запішыце гэты назоўнік правільна.

1) Агурочак;
2) рэзчык (па дрэве);
3) дойліцтва;
4) Брэстчына;
5) прыгоства.

**B10**. Выпішыце назоўнік, які пішацца праз злучок (на беларускай мове).

1) (Пол) яблока;
2) (лесо) полоса;
3) (гори) цвет;
4) (пол) лимона;
5) (плащ) палатка.

Репозиторий БГПУ

## Адказы

### Частка А

A1 — 1, 4, 5;
A2 — 3, 4;
A3 — 2, 4;
A4 — 2, 3;
A5 — 1, 4, 5;
A6 — 2, 3, 4;
A7 — 3, 4;
A8 — 1, 3, 4;
A9 — 5;
A10 — 1, 2, 3;

A11 — 3, 4;
A12 — 1, 3, 5;
A13 — 3, 5;
A14 — 3, 5;
A15 — 1, 2, 3;
A16 — 1, 4, 5;
A17 — 1, 2, 3;
A18 — 1, 3, 5;
A19 — 3, 5;
A20 — 3, 5;

A21 — 3, 4;
A22 — 1, 4;
A23 — 1, 3;
A24 — 1, 3, 5; A25 — 4, 5;
A26 — 2, 5;
A27 — 1, 3, 5;
A28 — 1, 3;
A29 — 3, 4;
A30 — 1, 2, 5.

### Частка В

B1 — рукапіс;
B2 — лагеры;
B3 — ланцуг;
B4 — карункі;
B5 — праехаць па вёсках;
B6 — рог (каровы);
B7 — шмат камянёў (камення);
B8 — Об'ю;
B9 — дойлідства;
B10 — плашч-палатка.

Репозиторий БГПУ